МІЖДЗЯРЖАЎНАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ЎСТАНОВА
ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра «Гуманітарныя дысцыпліны»

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

***Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў дзённай і завочнай форм навучання***

Магілёў 2024

УДК 811.161.3
ББК 81.2 Бел
Б43

Рэкамендавана да выдання
вучэбна-метадычным аддзелам
Беларуска-Расійскага ўніверсітэта

Адобрана кафедрай «Гуманітарныя дысцыпліны» «5» сакавіка 2024 г., пратакол № 10

Складальнік ст. выкладчык А. В. Шарапава

Рэцэнзент канд. філал. навук, дац. В. М. Шаршнёва

Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» ўключаюць у сябе тэставыя заданні для праверкі ведаў па розных раздзелах вучэбнай дысцыпліны, спіс літаратуры для вывучэння.

Прызначаецца студэнтам I курса ўсіх спецыяльнасцяў дзённай і завочнай форм навучання.

Вучэбнае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Адказны за выпуск А. П. Цумарава

Карэктар І. В. Галубцова

Камп'ютарная вёрстка Н. П. Паляўнічая

Падпісана ў друк . Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк трафарэтны. Умоўн.-друк. арк. . Вуч.-выд. арк. . Тыраж 36 экз. Заказ №

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Міждзяржаўная адукацыйная ўстанова вышэйшай адукацыі
«Беларуска-Расійскі ўніверсітэт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вырабляльніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/156 ад 07.03.2019.
Пр-т Міру, 43, 212022, г. Магілёў.

© Беларуска-Расійскі
ўніверсітэт, 2024

# Змест

Ад аўтара……………………………………………………………...……... 4
1 Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры………………… 4
2 Сістэмная арганізацыя беларускай мовы……………………….…….. 5
3 Беларуская мова сярод іншых моў…………………………………… 6
4 Гісторыя беларускай літаратурнай мовы……………………………... 7
5 Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь…………………………….. 9
6 Моўная інтэрферэнцыя і яе віды……………………………….……… 10
7 Нормы беларускай літаратурнай мовы: фанетычныя і арфаэпічныя нормы…………………………………………………………….…….….... 13
8 Нормы беларускай літаратурнай мовы: марфалагічныя нормы……... 15
9 Нормы беларускай літаратурнай мовы: сінтаксічныя нормы………... 17
10 Лексічная сістэма беларускай мовы………………………………….. 20
11 Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення………….. 23
12 Паняцце «тэрмін». Спецыфіка тэрмінаў……………………………... 23
13 Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі…… 25
14 Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы……………. 25
15 Навуковы стыль……………………………………………………….. 26
16 Афіцыйна-справавы стыль…………………………………………… 28
17 Культура прафесійнага маўлення…………………………………….. 29
Спіс літаратуры……………………………………………………….... 32

# Ад аўтара

Прапанаваныя ў метадычных рэкамендацыях тэсты ахопліваюць усе раздзелы вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» і акрэсліваюць мінімум ведаў, якімі мусіць авалодаць студэнт. Найперш гэтыя тэсты навучэнец можа выкарыстаць для аб’ектыўнай праверкі ўласных ведаў. Пасля вывучэння кожнай тэмы па дысцыпліне прапануецца выканаць комплекс заданняў у форме тэстаў. Кожнае пытанне мае чатыры варыянты адказаў, але толькі адзін з іх правільны. Самастойна ацаніць свае веды студэнт можа па шкале ацэнкі ведаў студэнтаў (табліца 1). Жадаем поспехаў!

Табліца 1 – Шкала ацэнкі ведаў студэнтаў

| Працэнт выкананых заданняў | < 50 | 50…61 | 62…70 | 71…78 | 79…84 | 85…89 | 90…94 | 95…97 | 98…99 | 100 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ацэнка ў балах | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |

# 1 Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры

1 Асноўнай характарыстыкай чалавека як асобы з’яўляецца наяўнасць у яго: а) здольнасці карыстацца мовай; б) верхніх і ніжніх канечнасцяў; в) языка, зубоў; г) мозгу.

2 Назавіце дзве асноўныя функцыі мовы: а) фатычная і акумулятыўная; б) намінатыўная і эмацыйная; в) камунікатыўная і пазнавальная; г) эстэтычная і выхаваўчая.

3 Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж назвай функцыі мовы і яе характарыстыкай, выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) эстэтычная, Б) камунікатыўная, В) намінатыўная, Г) акумулятыўная − 1) дапамагае называць прадметы і з’явы, 2) дапамагае людзям мець зносіны паміж сабой, перадаваць інфармацыю, 3) дапамагае ўздзейнічаць на пачуцці і думкі чалавека не толькі зместам, але і формай выказвання, 4) дапамагае людзям захоўваць традыцыі, нацыянальную самасвядомасць: а) А1, Б2, В3, Г4; б) А3, Б2, В1, Г4; в) А2, Б4, В3, Г1; г) А4, Б3, В2, Г1.

4 Пры дапамозе гэтай функцыі мовы людзі наладжваюць кантакты і рэгулююць адносіны паміж сабой, уступаюць у дыялогі. Гэта функцыя: а) фатычная; б) акумулятыўная; в) намінатыўная; г) эмацыйная.

5 Пры дапамозе гэтай функцыі мовы магчыма назапашванне традыцый, гісторыі, нацыянальнай самасвядомасці народа. Гэта функцыя: а) фатычная; б) акумулятыўная; в) намінатыўная; г) эмацыйная.

6 Пры дапамозе гэтай функцыі мовы магчыма называць прадметы, з’явы рэчаіснасці. Гэта функцыя: а) фатычная; б) акумулятыўная; в) намінатыўная; г) эмацыйная.

7 Пры дапамозе гэтай функцыі мовы магчыма выражаць эмоцыі, пачуцці, настрой. Гэта функцыя: а) фатычная (рэгулятыўная); б) акумулятыўная; в) намінатыўная; г) эмацыйная.

8 Асабліва выразна гэтая функцыя праяўляецца ў сітуацыях, дзе існуе культурна-моўная асіміляцыя аднаго народа другім. Мова ў такім выпадку з'яўляецца фактарам еднасці этнасу. Гэта функцыя: а) фатычная; б) акумулятыўная; в) намінатыўная; г) этнічная.

9 З прыведзеных тэорый вызначце тую, якая не звязана з паходжаннем мовы: а) логасная (рэлігійная); б) «грамадскай дамоўленасці»; в) этымалагічная (натуралістычная); г) тэорыя паходжання відаў.

10 Пра якую гіпотэзу паходжання мовы можна гаварыць, прычытаўшы ў Бібліі: «У пачатку было слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог»: а) логасная; б) «грамадскай дамоўленасці»; в) этымалагічная; г) матэрыялістычная.

## 2 Сістэмная арганізацыя беларускай мовы

1 Укажыце правільнае азначэнне паняцця «маўленне»: а) забяспечвае бесперапыннасць этнічнага і культурнага развіцця грамадскай супольнасці на працягу яе гісторыі; б) з'яўляецца спосабам захавання адзінства народа ў прасторы і часе; в) гэта перадача думак праз мову, пры дапамозе і праз пасрэдніцтва мовы; г) з'яўляецца формай трансляцыі ад пакалення да пакалення сацыяльнага вопыту і духоўнай культуры народа.

2 Знайдзіце няправільнае сцвярджэнне: а) мова − гэта сістэма знакаў, якія абазначаюць з'явы рэчаіснасці, а маўленне − спосаб перадачы думак праз мову, пры дапамозе і праз пасрэдніцтва мовы; б) мова служыць унутранай глыбіннай сутнасцю, а маўленне − знешняй з'явай, праз якую гэта сутнасць праяўляецца; в) мова з'яўляецца сацыяльнай, а маўленне − індывідуальнай з'явай; г) мова характарызуецца як канкрэтная і фізіялагічная з'ява, а маўленне − як абстрактная і псіхічная сутнасць.

3 Адзінкай маўлення не з'яўляецца: а) маналог; б) палілог; в) раман; г) тэкст.

4 У залежнасці ад спосабу перадачы зместу і ўнутранай арганізацыі тэксту не вылучаюць такі тып тэксту, як: а) апавяданне; б) санет; в) апісанне; г) разважанне.

5 Апавяданне − тып маўлення: а) які служыць для перадачы фактаў, з'яў, дзеянняў і г. д., што разгортваюцца ў часе, маюць дынаміку, у ім шмат дзеясловаў; б) у якім даецца лагічны і аргументаваны выклад думкі; в) які ўжываецца для характарыстыкі прадметаў, з'яў, асобы і г. д., ён статычны, таму часцей выкарыстоўваюцца назоўнікі, прыметнікі; г) падрыхтаванае выказванне з устойлівым сэнсавым адзінствам і сістэмай кампанентаў, аб'яднаных у адзіную структуру.

6 Разважанне − тып маўлення: а) які служыць для перадачы фактаў, з'яў, дзеянняў і г. д., што разгортваюцца ў часе, маюць дынаміку, у ім шмат

дзеясловаў; б) у якім даецца лагічны і аргументаваны выклад думкі; в) які ўжываецца для характарыстыкі прадметаў, з'яў, асобы і г. д., ён статычны, таму часцей выкарыстоўваюцца назоўнікі, прыметнікі; г) падрыхтаванае выказванне з устойлівым сэнсавым адзінствам і сістэмай кампанентаў, аб'яднаных у адзіную структуру.

7 Апісанне − тып маўлення: а) які служыць для перадачы фактаў, з'яў, дзеянняў і г. д., што разгортваюцца ў часе, маюць дынаміку, у ім шмат дзеясловаў; б) у якім даецца лагічны і аргументаваны выклад думкі; в) які ўжываецца для характарыстыкі прадметаў, з'яў, асобы і г. д., ён статычны, таму часцей выкарыстоўваюцца назоўнікі, прыметнікі; г) падрыхтаванае выказванне з устойлівым сэнсавым адзінствам і сістэмай кампанентаў, аб'яднаных у адзіную структуру.

8 Устанавіце адпаведнасць паміж выказваннем пра мову і яго аўтарам, выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор − мова; Б) Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!; В) Дала мне маці гэту мову / Як спадчыну і запавет; Г) Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў – 1) Францішак Багушэвіч, 2) Уладзімір Караткевіч, 3) Аляксей Пысін, 4) Алесь Разанаў: а) А1, Б2, В3, Г4; б) А3, Б2, В1, Г4; в) А2, Б4, В3, Г1; г) А4, Б1, В3, Г2.

9 Да штучных моў не адносіцца: а) валірыйская; б) шумерская; в) лінкос (лінгвакосміка); г) эльфійская.

10 Што не адносіцца да невербальных сродкаў зносін: а) азбука Морзэ; б) знакі дарожнага руху; в) мова глуханямых; г) эсперанта.

## 3 Беларуская мова сярод іншых моў

1 У XXI ст. у свеце налічваецца: а) 3000 афіцыйных моў і 5000 моў і дыялектаў; б) 1000 афіцыйных моў і 5000 моў і дыялектаў; в) 95 афіцыйных моў і ад 3000 да 6000 моў і дыялектаў; г) 100 афіцыйных моў і 1000 моў і дыялектаў.

2 Дакладна ўстанавіць колькасць моў у свеце немагчыма таму, што: а) кожная мова мае бясконцае мноства дыялектаў; б) пастаянна ўзнікаюць новыя мовы; в) многія мовы і дыялекты існуюць толькі ў пісьмовай форме; г) многія мовы і дыялекты існуюць толькі ў вуснай форме.

3 Адзначце правільнае сцвярджэнне: а) некаторыя мовы знікаюць па прычыне сваёй неразвітасці; б) мова − складаная шматузроўневая сістэма; в) у сучасным грамадстве міжнароднай з'яўляецца толькі англійская мова; г) сістэмнасць характэрна толькі для міжнародных моў.

4 Фактары, што ўплываюць на характар развіцця мовы: а) кліматычныя ўмовы; б) міжэтнічныя кантакты; в) феадальная сістэма гаспадарання; г) капіталістычная сістэма гаспадарання.

5 Беларуская мова адносіцца да : а) паўночнай падгрупы германскай групы; б) балтыйскай групы; в) усходняй падгрупы славянскай групы; г) раманскай групы.

6 Беларуская мова адносіцца да моўнай сям'і: а) індаеўрапейскай; б) мангольскай; в) угра-фінскай; г) семіта-хаміцкай.

7 Славянская група выдзелілася з індаеўрапейскай сям'і прыкладна: а) у V–IV тысячагоддзях да н. э.; б) у III–II тысячагоддзях да н. э.; в) у I тысячагоддзі да н. э.–I тысячагоддзі н. э.; г) 988 г.

8 Беларуская мова адносіцца да моўнай групы: а) раманскай; б) германскай; в) славянскай; г) балтыйскай.

9 Колькасць падгруп славянскай групы моў: а) 3; б) 4; в) 5; г) 6.

10 Беларуская мова адносіцца да моўнай падгрупы: а) усходнеславянскай; б) заходнеславянскай; в) старaславянскай; г) паўднёваславянскай.

11 Рассяленне славян завяршылася: а) у IV–V стст.; б) у V–VI стст.; в) у VI–VII стст.; г) у VII–VIII стст.

12 Фразеалагізм «размаўляць на розных мовах» мае значэнне: а) ведаць замежныя мовы; б) не разумець адзін аднаго; в) дасягнуць паразумення; г) іншасказальна выразіць думку.

13 Паэтычныя радкі «Кажуць, мова мая аджывае / Век свой ціхі: ёй знікнуць пара. / Для мяне яна вечна жывая, / Як раса, як сляза, як зара» належаць: а) Я. Коласу; б) П. Панчанку; в) Р. Баравіковай; г) В. Жыбулю.

14 Паэтычныя радкі «Народ пранясе цябе, родная мова, / Святлом незгасальным у сэрцы сваім / Праз цемру і годы змаганняў суровых» належаць: а) М. Багдановічу; б) П. Панчанку; в) М. Танку; г) А. Разанаву.

15 Паэтычныя радкі «Чую тваю жаўруковую музыку / Ў скошаных травах мурожных / Мова! Як сонца май беларускае / Ты свецішся словам кожным» належаць: а) А. Гаруну; б) А. Куляшову; в) У. Караткевічу; г) Я. Янішчыц.

## 4 Гісторыя беларускай літаратурнай мовы

1 Пісьмовая эпоха ва ўсходніх славян пачынаецца: а) паходам князя Алега ў Царград (Канстанцінопаль) у 907 г.; б) утварэннем Кіеўскай Русі ў 882 г.; в) хрышчэннем Кіеўскай Русі ў 988 г.; г) заснаваннем Кіева-Пячэрскага манастыра ў 1051 г.

2 Стараславянская мова – гэта: а) першая пісьмовая мова ўсходніх славян; б) мова, якая лягла ў аснову сучаснай беларускай літаратурнай мовы; в) адзіная вусная мова старажытных усходніх славян; г) сучасная мова ўсіх славян.

3 Ля вытокаў стараславянскага пісьменства стаяў: а) манах Нестар; б) Е. Полацкая і К. Тураўскі; в) Кірыла і Мяфодзій; г) У. Манамах.

4 Лінгвастылістычны аналіз славутага твора «Слова пра паход Ігаравы» (XII ст.) вылучае версію, што яго аўтар: а) Е. Полацкая; б) К. Тураўскі; в) Ф. Скарына; г) М. Гусоўскі.

5 Старабеларуская мова набыла статус дзяржаўнай у: а) Полацкім княстве; б) Вялікім Княстве Літоўскім; в) Рэчы Паспалітай; г) Рэспубліцы Беларусь.

6 Першай друкаванай кнігай на старабеларускай мове лічыцца: а) «Малая падарожная кніжыца» Ф. Скарыны; б) «Псалтыр» Ф. Скарыны; в) «Катэхізіс»

С. Буднага; г) «Евангелле» В. Цяпінскага.

7 Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж выдатным дзеячам і кнігай, якую ён выдаў, выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) Ф. Скарына; Б) С. Полацкі; В) М. Сматрыцкі; Г) С. Собаль − 1) «Рыфмалагіён», 2) «Граматыка», 3) «Апостал», 4) «Буквар»: а) А2, Б4, В3, Г1; б) А1, Б2, В3, Г4; в) А3, Б1, В2, Г4; г) А3, Б4, В2, Г1.

8 Выдатным справавым тэкстам на старабеларускай мове з’яўляецца: а) «Псалтыр»; б) «Статут Вялікага Княства Літоўскага»; в) «Чэцці-Мінеі»; г) «Александрыя».

9 Укажыце, які тэкст на старабеларускай мове быў створаны на Магілёўшчыне: а) «Апостал»; б) «Метры»; в) «Аповесць мінулых часоў»; г) «Баркалабаўскі летапіс».

10 Палітычная падзея, што стала кропкай адліку ў перыядзе заняпаду беларускай мовы: а) Беларусь увайшла ў склад Рэчы Паспалітай (1569 г.); б) прынята Брэсцкая унія (1596 г.); в) адбыўся Варшаўскі сейм (1696 г.); г) адбыўся падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.).

11 Новая беларуская літаратурная мова пачынае сваё адраджэнне ў XIX ст. на аснове : а) старажытнай літаратуры; б) народных гаворак; в) рускай і польскай моў; г) рускай і ўкраінскай моў.

12 Адзначце, хто з названых дзеячаў актыўна спрыяў адраджэнню беларускай мовы ў XIX ст.: а) М. Лермантаў; б) Ф. Багушэвіч; в) А. Міцкевіч; г) Я. Купала.

13 Беларуская інтэлігенцыя ў пачатку XX ст. аб’ядналася вакол газеты: а) «Звязда»; б) «Наша ніва»; в) «Мужыцкая праўда»; г) «Літаратура і мастацтва».

14 У 1918 г. падрыхтавана «Беларуская граматыка для школ», аўтарам якой з’яўляецца: а) Я. Карскі; б) Б. Тарашкевіч; в) М. Гарэцкі; г) В. Ластоўскі.

15 Упершыню ў гісторыі беларускай мовы юрыдычна замацоўваюцца абавязковыя для ўсіх нормы беларускага правапісу і граматыкі: а) праграмай газеты «Наша ніва» 1914 г.; б) пастановай Саўнаркама 1933 г.; в) пастановай СНК і ЦК УКП(б) «Аб абавязковым вывучэнні рускай мовы ў школах нацыянальных рэспублік і абласцей» 1938 г.; г) Законам «Аб мовах у БССР» 1990 г.

16 З пералічаных аўтараў не пісаў у XX ст.: а) А. Гарун; б) Я. Баршчэўскі; в) М. Танк; г) А. Пысін.

17 Не выходзіла ў XX ст. беларуская газета: а) «Наша доля»; б) «Звязда»; в) «Мужыцкая праўда»; г) «Літаратура і мастацтва».

18 У адпаведнасці з Законам «Аб мовах у БССР» беларуская мова набыла статус дзяржаўнай у: а) 1938 г.; б) 1956 г.; в) 1985 г.; г) 1990 г.

19 14 мая 1995 г. адбыўся агульнарэспубліканскі рэферэндум, па выніках якога быў прыняты закон аб набыцці статуса дзяржаўнай: а) рускай мовай; б) беларускай мовай; в) яўрэйскай мовай поруч з рускай; г) рускай мовай поруч з беларускай.

20 Паводле перапісу 2019 г., беларуская мова з’яўляецца роднай для: а) 100 % насельніцтва; б) 82,7 % насельніцтва; в) 54,1 % насельніцтва; г) 35,1 % насельніцтва.

## 5 Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь

1 На сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь: а) толькі руская мова мае статус дзяржаўнай; б) толькі беларуская мова мае статус дзяржаўнай; в) беларуская і руская мовы з'яўляюцца дзяржаўнымі; г) статус дзяржаўных моў не замацаваны юрыдычна.

2 Білінгвізм – гэта: а) валоданне і папераменнае карыстанне дзвюма мовамі; б) прысутнасць элементаў адной мовы ў маўленні на іншай мове; в) вусная гарадская паўмова ці, дакладней, маўленне, якое ўзнікае ў выніку механічнага змяшэння элементаў беларускай і рускай моваў у розных прапорцыях; г) сучасная беларуская літаратурная мова.

3 Лінгвістычны аспект двухмоўя звязаны з: а) аналізам мовы твораў тых аўтараў, якія пішуць на некалькіх мовах; б) інтэрферэнцыяй, г. зн. уздзеяннем адной мовы на другую ў фанетыцы, лексіцы, граматыцы; в) рознымі аспектамі навучання другой мове; г) адносінамі «білінгвізм – грамадства»: сферай выкарыстання і ступенню авалодвання мовамі; колькасцю ахопленых двухмоўем грамадзян, моўнай палітыкай дзяржавы.

4 Педагагічны аспект двухмоўя звязаны з: а) аналізам мовы твораў тых аўтараў, якія пішуць на некалькіх мовах; б) інтэрферэнцыяй, г. зн. уздзеяннем адной мовы на другую ў фанетыцы, лексіцы, граматыцы; в) рознымі аспектамі навучання другой мове; г) адносінамі «білінгвізм – грамадства»: сферай выкарыстання і ступенню авалодвання мовамі; колькасцю ахопленых двухмоўем грамадзян, моўнай палітыкай дзяржавы.

5 Сацыялінгвістычны аспект двухмоўя звязаны з: а) аналізам мовы твораў тых аўтараў, якія пішуць на некалькіх мовах; б) інтэрферэнцыяй, г. зн. Уздзеяннем адной мовы на другую ў фанетыцы, лексіцы, граматыцы; в) рознымі аспектамі навучання другой мове; г) адносінамі «білінгвізм – грамадства»: сферай выкарыстання і ступенню авалодання мовамі; колькасцю ахопленых двухмоўем грамадзян, моўнай палітыкай дзяржавы і г. д.

6 Літаратуразнаўчы аспект двухмоўя звязаны з: а) аналізам мовы твораў тых аўтараў, якія пішуць на некалькіх мовах; б) інтэрферэнцыяй, г. зн. уздзеяннем адной мовы на другую ў фанетыцы, лексіцы, граматыцы; в) рознымі аспектамі навучання другой мове; г) адносінамі «білінгвізм – грамадства»: сферай выкарыстання і ступенню авалодвання мовамі; колькасцю ахопленых двухмоўем грамадзян, моўнай палітыкай дзяржавы і г. д.

7 Псіхалагічны аспект двухмоўя звязаны з: а) асаблівасцямі псіхалагічнага складу індывіда, з яго разумовымі здольнасцямі, эмацыйнай прыстасаванасцю, з праблемамі пераключэння з аднаго моўнага кода на другі; б) інтэрферэнцыяй, г. зн. уздзеяннем адной мовы на другую ў фанетыцы, лексіцы, граматыцы; в) рознымі аспектамі навучання другой мове; г) адносінамі «білінгвізм – грамадства»: сферай выкарыстання і ступенню авалодвання мовамі; колькасцю ахопленых двухмоўем грамадзян, моўнай палітыкай дзяржавы і г. д.

8 Рэцэпцыйны ўзровень білінгвізму – гэта: а) разуменне маўлення, якое належыць другаснай маўленчай сістэме; б) уменне ўзнавіць прачытанае і пачутае;

в) уменне не толькі разумець і ўзнаўляць, але і будаваць асэнсаваныя выказванні; г) гаварэнне больш, чым на дзвюх мовах.

9 Рэпрадукцыйны ўзровень білінгвізму – гэта: а) разуменне маўлення, якое належыць другаснай маўленчай сістэме; б) уменне ўзнавіць прачытанае і пачутае; в) уменне не толькі разумець і ўзнаўляць, але і будаваць асэнсаваныя выказванні; г) гаварэнне больш, чым на дзвюх мовах.

10 Прадукцыйны ўзровень білінгвізму – гэта: а) разуменне маўлення, якое належыць другаснай маўленчай сістэме; б) уменне ўзнавіць прачытанае і пачутае; в) уменне не толькі разумець і ўзнаўляць, але і будаваць асэнсаваныя выказванні; г) гаварэнне на дзвюх і болей мовах.

11 У Кіеўскай Русі існавала: а) стараславянска-старажытнарускае двухмоўе; б) беларуска-царкоўнаславянскае двухмоўе; в) беларуска-польскае двухмоўе; г) беларуска-рускае двухмоўе.

12 У часы Вялікага Княства Літоўскага існавала: а) стараславянска-старажытнарускае двухмоўе; б) беларуска-царкоўнаславянскае двухмоўе; в) беларуска-польскае двухмоўе; г) беларуска-рускае двухмоўе.

13 У часы Рэчы Паспалітай існавала: а) стараславянска-старажытнарускае двухмоўе; б) беларуска-царкоўнаславянскае двухмоўе; в) беларуска-польскае двухмоўе; г) беларуска-рускае двухмоўе.

14 У часы, калі Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай імперыі, існавала: а) стараславянска-старажытнарускае двухмоўе; б) беларуска-царкоўнаславянскае двухмоўе; в) беларуска-польскае двухмоўе; г) беларуска-рускае двухмоўе.

15 У сучасны перыяд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь існуе: а) стараславянска-старажытнарускае двухмоўе; б) беларуска-царкоўнаславянскае двухмоўе; в) беларуска-польскае двухмоўе; г) беларуска-рускае двухмоўе.

## 6 Моўная інтэрферэнцыя і яе віды

1 Моўная інтэрферэнцыя – гэта: а) валоданне і папераменнае карыстанне дзвюма мовамі; б) прысутнасць элементаў адной мовы ў маўленні на іншай мове; в) вусная гарадская паўмова ці, дакладней, маўленне, якое ўзнікае ў выніку механічнага змяшэння элементаў беларускай і рускай моваў; г) сучасная беларуская літаратурная мова.

2 Фанетычная інтэрферэнцыя звязана з : а) наяўнасцю спецыфічных фанетычных рысаў у маўленні; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) разыходжаннямі ў граматычным афармленні рускіх і беларускіх слоў.

3 Адзначце словы, у якіх у рускім маўленні беларуса можа праявіцца фанетычная інтэрферэнцыя: а) ваза, циркуль, машина; б) рис, чертёж, теплоёмкость; в) трактор, инженер, ноутбук; г) зеркало, файл, карандаш.

4 Адзначце словы, у якіх у рускім маўленні беларуса можа праявіцца фанетычная інтэрферэнцыя: а) капот, борт, салон; б) стартер, вентиль, реле;

в) буфер, каркас, карбюратор; г) винт, кабина, фара.

5 Акцэнтная інтэрферэнцыя звязана з: а) разыходжаннямі ў націску ў рускіх і беларускіх словах; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) разыходжаннямі ў граматычным афармленні рускіх і беларускіх слоў.

6 Адзначце групу слоў, у якіх пры перакладзе на беларускую мову можа праявіцца акцэнтная інтэрферэнцыя: а) некоторые, было, имя; б) рука, нога, голова; в) буфер, каркас, карбюратор; г) чертёж, рейсфедер, логарифм.

7 Адзначце групу слоў, у якіх пры перакладзе на беларускую мову можа праявіцца акцэнтная інтэрферэнцыя: а) капот, борт, салон; б) стартер, вентиль, реле; в) спина, одиннадцать, звонит; г) механика, энергия, семинар.

8 Словаўтваральная інтэрферэнцыя звязана з: а) разыходжаннямі ў націску ў рускіх і беларускіх словах; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) несупадзеннем словаўтваральных марфем аднакаранёвых беларускіх і рускіх слоў.

9 Адзначце групу слоў са словаўтваральнай інтэрферэнцыяй: а) гравітацыённы, карэкціраваць, ганімы; б) эмацыйны, нарацыйны, пазіцыйны; в) планаваць, адаптаваць, тэлефанаваць; г) слухач, чытач, глядач.

10 Адзначце групу слоў са словаўтваральнай інтэрферэнцыяй: а) плануемы, абрадавацца, беспрынцыпны; б) атлетычны, па-чалавечы, бязлюднасць; в) фармуляваць, тэставаць, кантраляваць; г) дзіцячы, юначы, старэчы.

11 Лексічная інтэрферэнцыя звязана з: а) наяўнасцю спецыфічных фанетычных рысаў у мовах; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) разыходжаннямі ў граматычным афармленні рускіх і беларускіх слоў.

12 Укажыце прыклады лексічнай інтэрферэнцыі : а) гуляць ролю; б) ісці на завод; в) працаваць на разрыў аорты; г) залатое поле.

13 Укажыце прыклады лексічнай інтэрферэнцыі: а) сеяць жыта; б) шэры аўтамабіль; в) выпіць шклянку; г) адчыніць вочы.

14 Укажыце, якія словы ў пэўным кантэксце могуць стаць прыкладам лексічнай інтэрферэнцыі: а) качка, бяспечны; б) дзень, ноч; в) генератар, рухавік; г) сінус, косінус.

15 Укажыце, якія словы ў пэўным кантэксце могуць стаць прыкладам лексічнай інтэрферэнцыі: а) спонсар, фундатар; б) дзень, ноч; в) нядзеля, сварка; г) карозія, разбурэнне.

16 Марфалагічная інтэрферэнцыя звязана з: а) наяўнасцю спецыфічных фанетычных рысаў у мовах; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) з разыходжаннямі ў граматычным афармленні рускіх і беларускіх слоў.

17 Знайдзіце сказ з марфалагічнай інтэрферэнцыяй: а) У гэтым годзе нашы

гімнасткі выйгралі дзве залатыя медалі; б) На вуліцы прыцемак; в) Сёння раніцаю ліў першы дожджык з громам; г) Я пайшоў у школу.

18 Знайдзіце сказ з марфалагічнай інтэрферэнцыяй: а) У гэтым годзе нашы гімнасткі выйгралі два залатыя медалі; б) Надпіс на шыльдах была на дзвюх дзяржаўных мовах; в) Суніц у лесе нямала; г) Мы − студэнты Беларуска-Расійскага ўніверсітэта.

19 Сінтаксічная інтэрферэнцыя звязана з: а) наяўнасцю спецыфічных фане-тычных рысаў у мовах; б) наяўнасцю спецыфічных патрабаванняў да будовы словазлучэнняў, простых і складаных сказаў; в) заменай беларускай лексікі на рускую і наадварот; г) разыходжаннямі ў граматычным афармленні рускіх і беларускіх слоў.

20 Знайдзіце сказ з сінтаксічнай інтэрферэнцыяй: а) З прычыны занятасці інжынер не прачытаў свежы часопіс; б) «Трэба паслаць па бацьку», − сказала настаўніца; в) Прыйшоў час ісці ў грыбы; г) Мой сусед часта смяецца над іншымі людзьмі.

21 Знайдзіце сказ з сінтаксічнай інтэрферэнцыяй: а) Максім Багдановіч яшчэ ў маладосці захварэў туберкулёзам; б) Ён вярнуўся ў горад маладосці і з радасцю хадзіў па знаёмых мясцінах; в) Здароў, марозны, звонкі вечар!; г) Студэнтам трэба старанна рыхтавацца да экзаменаў.

22 Трасянка − гэта: а) валоданне і папераменнае карыстанне дзвюма мовамі; б) прысутнасць элементаў адной мовы ў маўленні на іншай мове; в) вусная гарадская паўмова ці, дакладней, маўленне, якое ўзнікае ў выніку механічнага змяшэння элементаў беларускай і рускай моваў у розных прапорцыях; г) сучасная беларуская літаратурная мова.

23 Знайдзіце прыклад трасянкі: а) Максім Багдановіч яшчэ ў маладосці захварэў туберкулёзам; б) За ўсё, што вы расказалі, я вас так дзякую; в) Ад пра-дзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына; г) Хто як хаціт, тот так і гаварыт.

24 Знайдзіце прыклад трасянкі: а) Тудэма-сюдэма, куды тут садзіцца! Ноч на дварэ, кабыла за плотам, паўвярсты да дому, а гэты, тудэма-сюдэма, начніца касавокая, не вытрымаў, каб людзям не нарабіць уночы неспакойства; б) Я вапшчэ не хацеў ісці вучыцца ва ўніверсітэт; в) Пад казачным дубам над Нёманам сінім хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне; г) Кішкі марш іграюць.

25 Знайдзіце прыклад трасянкі: а) Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая; б) Я кахаю маму і тату; в) Ідзём мы неяк з Бобікам. Ажно ляціць качка. Не, не качка − гусь дзікі; г) Бегчы на злом галавы.

# 7 Нормы беларускай літаратурнай мовы: фанетычныя і арфаэпічныя нормы

1 Адзначце слова, у якім ётавыя галосныя абазначаюць адзін гук: а) эксплуатацыя; б) тангенс; в) іскры; г) барэльеф.

2 Адзначце слова, у якім ётавыя галосныя абазначаюць два гукі: а) рэле; б) якар; в) інстытут; г) зычлівы.

3 Адзначце слова, у якім колькасць гукаў і літар не супадае: а) удзячнасць; б) станок; в) рэйсфедар; г) малаток.

4 Адзначце слова, у якім вымаўленне супадае з напісаннем: а) стружка; б) зніжка; в) падмурак; г) чарцёж.

5 Адзначце слова, у якім вымаўленне не супадае з напісаннем: а) падлік; б) экзотыка; в) іслам; г) файл.

6 Адзначце слова з фанетычным падаўжэннем: а) ладдзя; б) коннік; в) аддаць; г) бяззубы.

7 Адзначце слова з марфалагічным падваеннем: а) расстроены; б) забужжа; в) пытанне; г) стагоддзе.

8 Адзначце слова, у якім вымаўляецца падоўжаны гук [ц]: а) у торбачцы; б) спадцішка; в) канфеці; г) падцягнуты.

9 Адзначце слова, у якім вымаўляецца падоўжаны гук [ц’]: а) карытца; б) адцурацца; в) пяццю; г) на палічцы.

10 Адзначце слова, у якім вымаўляецца падоўжаны гук [ч]: а) на печцы ; б) маршрутчык; в) канечны; г) стрыечны.

11 Адзначце фанетычнае слова, у якім ёсць гук [с]: а) без кладкі; б) без інфармацыі; в) без жадання; г) без шанавання.

12 Адзначце слова, у якім ёсць гук [ш]: а) рыжскі; б) скамарошскі; в) пераможца; г) цялежка.

13 Адзначце слова, у якім усе зычныя глухія: а) алмаз; б) адшукаць; в) утаіць; г) цімафееўка.

14 Адзначце слова, у якім усе зычныя звонкія: а) валан; б) ферма; в) рашэнне; г) ланцуг.

15 Адзначце слова, у якім 3 мяккія зычныя гукі: а) схіліцца; б) камандзіраваць; в) мілагучнасць; г) няправільнае.

16 Адзначце слова, у якім 2 мяккія зычныя гукі: а) лебедзь; б) стамляешся; в) знішчэнне; г) згінаць.

17 Адзначце слова, у якім ёсць 2 шыпячыя гукі: а) Магілёўшчына; б) Полаччына; в) на шашцы; г) інжынірынг.

18 Адзначце слова, у якім ёсць 2 свісцячыя гукі: а) засмяяцца; б) дзікунства; в) у спешцы; г) зацыраваць.

19 Адзначце словы, якія складаюцца з 6 гукаў: а) аміяк; б) аддзяліць; в) нівелір; г) асфальтны.

20 Адзначце словы, у якіх вымаўляецца выбухны гук [г]: а) галава, горад; б) анекдот, гузік; в) газа, разгул; г) гатавальня, графіка.

21 Адзначце словы, у якіх вымаўляецца фрыкатыўны гук [г]: а) ганак, гузік;

б) гвалт, экзэмпляр; в) лязг, бульдог; г) фігура, гіпатэнуза.

22 Адзначце слова, у якім 3 зычныя гукі: а) яблык; б) ручнік; в) рубель; г) рэакцыя.

23 Адзначце слова, у якім 4 зычныя гукі: а) ссякаць; б) змеяед; в) тангенс; г) ядзерны.

24 Адзначце групы слоў з націскам на 2-м складзе: а) цяжар, знахар; б) крэмень, мезенец; в) вольха, асака; г) адзінаццаць, чатырнаццаць.

25 Адзначце групы слоў з націскам на 3-м складзе: а) шэсцьдзесят, адскочыць; б) гліняны, кідацца; в) электрапрывод, камбайнер; г) металургія, паліграфія.

## 8 Нормы беларускай літаратурнай мовы: марфалагічныя нормы

1 Адзначце групу назоўнікаў, лік якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах: а) дрова, опилки; б) каникулы, дрожжи; в) ворота, станок; г) крупа, поведение.

2 Адзначце групу назоўнікаў, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах: а) бровь, щука; б) глубь, шампунь; в) верфь, ширь; г) глушь, Сибирь.

3 Адзначце словазлучэнне, у якім прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка: а) прыўзнятая брыво; б) ваенны аташэ; в) далёкія Чылі; г) строгае ДАІ.

4 Адзначце словазлучэнне, у якім прыметнік няправільна дапасаваны да назоўніка: а) шырокі Місісіпі; б) смачнае эскімо; в) прыгожы Дэлі; г) прэстыжны БРУ.

5 Адзначце назоўнік, які ў родным склоне адзіночнага ліку мае канчатак -а (-я): а) катод; б) набор; в) грып; г) пераможца.

6 Адзначце назоўнік, які ў родным склоне адзіночнага ліку мае канчатак -у (-ю): а) тэрмін; б) ом; в) грам; г) атам.

7 Адзначце назоўнік, у якім у творным склоне адзіночнага ліку адбываецца падаўжэнне зычных асновы: а) вадкасць; б) замець; в) шампунь; г) аўтамабіль.

8 Адзначце назоўнік, які мае канчатак -ым (-ім) у творным склоне адзіночнага ліку: а) Іванам (Рагачоў); б) вёска пад (Рагачоў); в) горадам (Магілёў); г) бітва пад (Валожын).

9 Адзначце назоўнік, у якім у месным склоне адзіночнага ліку адбываецца чаргаванні зычных: а) блок; б) рычаг; в) аўтадарога; г) страх.

10 Адзначце назоўнік, які мае канчатак -у (-ю) у месным склоне адзіночнага ліку: а) блок; б) бензін; в) конь; г) трэст.

11 Адзначце сярод назоўнікаў, запісаных у дужках, той назоўнік, які мае канчатак -ам (-ям): а) па (старонкі) падручніка; б) дапамагчы (сябры); в) падарожжа па (гарады); г) пабегаць па (кабінеты).

12 Адзначце назоўнік, склонавая форма якога запісана правільна: а) ґаварыць па селектары; б) стаяць каля пад’езду будынка; в) напісаць Віце; г) сказаць дзядуле.

13 Адзначце назоўнік, які пішацца разам: а) (паў) Беларусі; б) (стоп) сігнал; в) (жалеза) бетон; г) (міні) рынак.

14 Адзначце назоўнік, які не пішацца праз злучок: а) (метэа) станцыя; б) (вакуум) насос; в) (дызель) матор; г) (норд) ост.

15 Адзначце правільна напісаны назоўнік: а) кілаватгадзіна; б) экспрэс-кафэ; в) грос-майстар; г) міні матч.

16 Адзначце правільна ўтвораную форму ступеняў параўнання прыметнікаў: а) больш важнейшы; б) найбольш адпаведны; в) найбольш горшы; г) найменш святлейшы.

17 Адзначце сказ, у якім ступені параўнання прыметнікаў ужыты правільна: а) Тут смех і жарты, таўканіна – цікавейшая часіна!; б) Муж гаспадыні быў старэй яе гадоў на пятнаццаць; в) Травы ачысцяцца, дрэвы памыюцца, лівень не зломіць іх – стануць дужэй; г) На свеце лепшага кутка няма, чым той, дзе маці нарадзіла.

18 Адзначце словазлучэнне, прыметнік у якім пішацца разам: а) медна (рудны) прыіск; б) Заходне (Еўрапейская) нізіна; в) вакуум (насосная) станцыя; г) чырвона (жоўтая) іржа.

19 Адзначце прыметнік, які пішацца праз злучок: а) каменна (вугольны) камбінат; б) заходне (еўрапейскія) краіны; в) адносна (спакойны); г) паўднёва (заходні) вецер.

20 Адзначце правільна напісаны прыметнік: а) жалеза-бетонны; б) водаза-борны; в) радыё-фізічны; г) глеба-апрацоўчы.

21 Адзначце прыметнік, у якім трэба ўставіць літару «ц»: а) буйні…кі; б) Нью-Ёр…кі; в) таджы…кі; г) Слаўгара…кі.

22 Адзначце прыметнік, у якім трэба ўставіць спалучэнне «кс»: а) юна…кі; б) Беласто…кі; в) туркмен…кі; г) Рэйк’яві…кі.

23 Адзначце прыметнік, у якім трэба ўставіць мяккі знак: а) жнівен…скі; б) Цянь-шан…скі; в) Свержан…скі; г) Любан…скі.

24 Адзначце правільна ўтвораны і запісаны прыметнік: а) Маладзечанскі; б) абедзены; в) Асіповічскі; г) Сцёпкін.

25 Адзначце няправільна пабудаванае спалучэнне лічэбніка з назоўнікам: а) дзявяцера інжынераў; б) дзве цэлыя пяць дзясятых цэнтнераў; в) абое, брат і сястра; г) абодва вядры.

26 Адзначце сказ з правільна ўжытым і запісаным лічэбнікам: а) Ніна з Пецем стаялі і абодва маўчалі; б) Хлопцы чакалі адно аднаго; в) Прыйшло дваццаць чацвёра студэнта; г) Кіламетра за паўтара ад вёскі рос невялічкі бярэзнік.

27 Адзначце словазлучэнне, правільна перакладзенае на беларускую мову: а) менее десяти дней – менш дзесяці дзён; б) шесть целых четыре десятых метра – шэсць цэлых чатыры дзясятыя метраў; в) километрах в четырех – кіламетры за чатыры; г) двум студенткам – двум студэнткам.

28 Адзначце сказы з правільна запісанымі склонавымі формамі лічэбнікаў: а) Мяцеліца не сціхала на працягу траіх сутак; б) Для ста пяцідзясятага наведвальніка прадугледжваліся пэўныя льготы; в) Выкладчык праэкзаменаваў

сарака васьмі вучняў; г) Даўжыня «Тытаніка» каля двухсот шасцідзесяці дзевяці метраў.

29 Адзначце сказ, у якім трэба ўжыць займеннік цябе: а) Радзіма, у сэрцы мы носім адданасць (табе, цябе) і любоў; б) Сёння купім (табе, цябе) новы камп'ютар; в) Дзякую (табе, цябе), што ты мяне выслухаў; г) Я зусім не памятаю (табе, цябе) маленькім.

30 Адзначце сказ, у якім трэба ўжыць займеннік табе: а) Вось (табе, цябе) і смешкі з бабінай плешкі; б) Я буду думаць пра (табе, цябе) ўвесь час; в) Я зусім не памятаю (табе, цябе) студэнтам; г) Радзіма, (табе, цябе) не зламалі навалы.

31 Адзначце сказ, у якім трэба ўжыць займеннік сябе: а) Чаго (сабе, сябе) не жадаеш, таго і другому не зыч; б) Не гудзі, а на (сабе, сябе) паглядзі; в) З вялікага гурту выбірай (сабе, сябе) курту; г) Людзі прыходзяць на зямлю, каб пакінуць добрую памяць аб (сабе, сябе).

32 Адзначце сказ, у якім трэба ўжыць займеннік сабе: а) Зарубі (сабе, сябе) на носе; б) Звяртае на (сабе, сябе) увагу арыгінальная манера мастака; в) Няхай (сабе, сябе) спытае кожны, ці пасадзіў ён дрэва ў жыцці; г) Хто сам (сабе, сябе) сцеражэ, таго й Бог беражэ.

33 Адзначце займеннік, які не пішацца праз злучок: а) абы/што; б) што/сьці; в) які/кольвечы; г) сёй/той.

34 Адзначце дзеяслоў: а) выбраны; б) мабыць; в) крыўдзішся; г) з'яўляючыся.

35 Адзначце дзеяслоў I спражэння: а) лічыць; б) палоць; в) карміць; г) залежаць.

36 Адзначце дзеяслоў II спражэння: а) калоць; б) спаць; в) аддаваць; г) несці.

37 Адзначце дзеепрыметнік: а) ветлівы; б) выбелены; в) кожны; г) патрабавальны.

38 Адзначце дзеепрыслоўе: а) распрануўшыся; б) прынесены; в) адбудаваны; г) усміхнуўся.

39 Адзначце выпадак раздзельнага напісання «не» з дзеепрыметнікам / дзеепрыслоўем: а) (не, ня) спешны рамонт; б) (не,ня) скошаныя мурагі; в) (не, ня) дыхаючы; г) (не, ня) заўважаная памылка.

40 Адзначце сказ, у якім дзеепрыметнік / дзеепрыметны зварот не адасабляецца коскамі: а) Стомленыя мы прыселі адпачыць; б) Чаромха зацвіла прыгожымі белымі кветкамі сабранымі ў гронкі; в) На залітай сонцам маладой сасонцы прыхарошвалася вавёрка; г) Палянка зарослая маліннікам чырванню пералівалася на сонцы.

41 Адзначце дзеепрыслоўе / дзеепрыслоўны зварот, які не трэба адасабляць коскамі: а) Напрацаваўшыся да поту пад'ясі ў ахвоту; б) Даводзілася працаваць не пакладаючы рук; в) Чалавек ішоў азіраючыся па баках; г) Рухавыя і спрытныя бусляняты падскокваючы з месца на месца адно за адным падымаліся ў восеньскае неба (М. Ткачоў).

42 Адзначце не ўласцівы для беларускай мовы дзеепрыметнік: а) асмялеўшая; б) стомленая; в) сплючая; г) закрэсленая.

43 Адзначце правільна ўтворанае дзеепрыслоўе: а) плывя; б) грэячы; в) сплючы; г) паглядзеўшы.

44 Адзначце сказ з няправільна ўжытай формай ступені параўнання прыслоўяў: а) А красавіцкае сонца грэе з кожным днём усё больш цяплей; б) Кожнаму хацелася выканаць даручэнне як мага хутчэй; в) У лесе стала яшчэ больш ціха, яшчэ больш глуха; г) Дубровы выглядаюць яшчэ больш урачыста, чым некалькі дзён назад.

45 Адзначце сказ з правільна ўжытай формай ступені параўнання прыслоўяў: а) Валя прыйшла раней усіх; б) Непаспешліва, пазней за ўсе іншыя дрэвы, жаўцелі дубы; в) Працаваў Сцёпка больш старанней, чым звычайна; г) Андрэй раптам адчуў, што яму стала гаршэй.

## 9 Нормы беларускай літаратурнай мовы: сінтаксічныя нормы

1 Адзначце словазлучэнне з правільным спалучэннем лічэбніка з назоўнікам: а) абодва, маці і бацька; б) паўтары вядра; в) тры новыя падручнікі; г) два цэлыя сем дзясятых цэнтнераў.

2 Адзначце словазлучэнне з няправільным дапасаваннем лічэбніка да назоўніка: а) абодва байцы; б) абедзве бібліятэкі; в) трыццаць два горада; г) праэкзаменаваць сорак два студэнты.

3 Адзначце словазлучэнне, правільна перакладзенае на беларускую мову: а) полторы тонны – паўтары тоны; б) около двух берез – каля двух бяроз; в) двое суток – абое сутак; г) семь целых две десятых метра – сем цэлых два дзясятых метра.

4 Адзначце словазлучэнне, няправільна перакладзенае на рускую мову: а) абодва паляўнічых – оба охотника; б) адна трэцяя задання – одна треть задания; в) паўтара рубля – полтора рубля; г) чатыры дзясятыя кіламетра – четыре десятые километра.

5 Адзначце рады, у якіх усе словазлучэнні адпавядаюць нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы: а) абедзвюм вучаніцам, на працягу траіх сутак; б) восемдзесят шэсць цэлых адна дзясятая кілаграмаў, дваццаць двое нажніц; в) даставіць сямідзесяці трох пасажыраў, чацвёра генералаў; г) трыццаць два студэнты, на абедзвюх старонках.

6 Адзначце словазлучэнне, якое не адпавядае нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы: а) бачыць сваімі вачамі; б) чытаць самому сабе; в) гуляць па горадзе; г) не вывучыў праз ляноту.

7 Адзначце словазлучэнне, пабудаванае ў адпаведнасці з патрабаваннямі літаратурнай нормы: а) загадчык кафедрай; б) два кіслых яблыкі; в) даслаць па адрасе; г) захварэць на грып.

8 Адзначце словазлучэнне, няправільна перакладзенае на беларускую мову: а) прийти за умным советом – прыйсці па разумную параду; б) приехать в четвертом часу – прыехаць а чацвёртай гадзіне; в) опоздать из-за товарища – спазніцца праз таварыша; г) скучать о друзьях – сумаваць аб сябрах.

9 Адзначце словазлучэнне, няправільна перакладзенае на рускую мову: а) гаварыць на карысць − говорить в пользу; б) маладзей за астатніх – моложе остальных; в) паехаць у лес па дровы – поехать в лес за дровами; г) успамінаць пра лета – вспоминать про лето.

10 Знайдзіце адпаведнік рускаму словазлучэнню «пойти в лес за орехами»: а) пайсці ў лес за арэхамі; б) пайсці ў лес па арэхі; в) пайсці ў лес у арэхі; г) пайсці ў лес з-за арэхаў.

11 Знайдзіце адпаведнік рускаму словазлучэнню «у меня болит сердце»: а) мне баліць сэрца; б) у мяне баліць на сэрцы; в) у мяне баліць сэрца; г) у мяне баліць у сэрцы.

12 Знайдзіце адпаведнік рускаму словазлучэнню «уход за больным»: а) догляд хворага; б) догляд за хворым; в) нагляданне за хворым; г) нагляд за хворым.

13 Знайдзіце адпаведнік рускаму словазлучэнню «по случаю юбилея»: а) па выпадку юбілею; б) з нагоды юбілею; в) з выпадку юбілею; г) у выпадку юбілею.

14 Знайдзіце адпаведнік рускаму словазлучэнню «извиняться перед подругой»: а) выбачаць сяброўку; б) перапрашаць сяброўку; в) даравацьсяброўцы; г) даравацьсяброўку.

15 Адзначце сказ, у якім правільна пастаўлены працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам: а) На вайне амаль кожны выйгрыш – вынік звышчалавечых намаганняў (А. Марціновіч); б) Людзі – заўсёды дакладная копія свайго часу (М. Зяньковіч); в) Тысячагадовае радаводнае дрэва Беларусі, беларускай культуры – трывалае і разгалістае (Г. Кісялёў); г) Адзін у полі – не воін (Прыказка).

16 Адзначце сказ, у якім знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна: а) Астап, хаця задужа і выхваляўся дачкой, але ж і ганарыўся ёю (М. Лынькоў); б) Душу сціскае болем не то смутак, не то жаль (Я. Колас); в) Быў дастатак поўны ў хаце і парадак, і спакой (А. Астрэйка); г) Майскае сонца высока стаяла ў ясным небе, кідала на зямлю снапы гарачага прамення, і залівала асляпляльным бляскам увесь свет (Я. Колас).

17 Адзначце сказ, у якім на месцы шматкроп'я трэба паставіць двукроп'е: а) У матулі стол не пустуе – чым багата, тым і частуе… пірагом, верашчакаю, сырам, ды смятанай, ды позіркам шчырым (Д. Бічэль-Загнетава); б) Дзяцінства, маладосць, юнацтва, сілы, здароўе… словам, усё аддавалася зямлі (П. Галавач); в) З 1786 года пры [Ружанскім] палацы працавалі… невялікая фабрыка шаўковых паясоў, шпалераў, абрусаў з гербамі і суконная фабрыка (В. Супрун); г) Пад паветкай стаялі … канапка, варштат, ляжалі акуратна складзеныя дошкі (І. Шамякін).

18 Адзначце сказ, у якім на месцы шматкроп'я трэба паставіць працяжнік: а) Раніцай і трава каля платоў, і палі, і стрэхі… усё было па-зімоваму белае (І. Мележ); б) На прыгуменні, поруч з садам, павець з гумном стаяла радам, а пад паветкаю прылады… вазок, калёсы, панарады, старыя сані, восі, колы і вулляў некалькі на пчолы (Я. Колас); в) Бацька прыбраў з воза ўсё… плуг, барану, мяшкі з бульбай і ўвайшоў у хату (М. Зарэцкі); г) Калісьці каля нашай

вёскі спыніліся салдаты. Вучыліся ваяваць… стралялі, акопы капалі, наступалі (В. Хомчанка).

19 Адзначце сказ, у якім знакі прыпынку пры азначэннях расстаўлены правільна: а) Пахла зямля, багата акропленая расою (Я. Колас); б) З вялікага, на ўсю сцяну акна можна любавацца прасторнай плошчай (В. Вольскі); в) Змораныя мы ледзь ішлі (І. Грамовіч); г) Хмарка, светлая, спакойна плыла ў небе (К. Кірэенка).

20 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя курсівам словы абавязкова трэба пісаць праз злучок: а) Так спявала *дзяўчына Алеся*, а ў грудзях хвалявалася гора (М. Танк); б) Кукавала зязюля ў зялёным лесе, гадавала матуля *дачушку Алесю* (Я. Купала); в) Далёка разліваецца *рака Бяроза* ўвесну (М. Ваданосаў); г) Зашпіліўшы на ўсе гузікі белыя сарафаны, стынуць прастадушныя *маладухі бярэзінкі* («Звязда»).

21 Адзначце сказ, у якім знакі прыпынку пры акалічнасцях, выражаных дзеепрыслоўным зваротам, расстаўлены правільна: а) Праз момант промні чырвонага сонца зазіхацелі на пабеленай траве, надаючы ёй надзвычайную прыгажосць (Я. Крамко); б) Не азіраючыся, і нікога не бачачы, пабегла, паплыла [Мар'я] да магазіна (Б. Сачанка); в) Майскі ветрык страсаючы суквецці-каташкі клубіць пылком у прыгожа прыбраных, бы да свята, зялёных кронах (А. Курскоў); г) Крыжаносцы не без падставы бачылі ў Давыдзе Гарадзенскім свайго найбольш небяспечнага ворага і не маючы моцы знішчыць яго, вырашылі адпомсціць інакш (М. Багадзяж).

22 Адзначце сказ, у якім выдзеленыя курсівам словы з'яўляюцца пабочнымі і іх трэба выдзеліць коскамі: а) Невыпадкова сакавік *часам* называюць месяцам святла (з часопіса «Родная прырода»); б) Старыя шпакі *відаць* практыкавалі маладых у лятанні (Я. Колас); в) Там *відаць* зялёненькія стужкі лёну (Я. Колас); г) Позняй восенню *нават* днём трымаюцца прыцемкі ў лесе (В. Хліманаў).

23 Адзначце сказ, у якім правільна расстаўлены знакі прыпынку пры параўнальным звароце: а) Усё відаць, як на далоні (М. Лынькоў); б) Віцебск быў вядомы са старонак летапісаў гістарычнай літаратуры, як Віцепск, Відзьбеск, Віцьбеск (Л. Лыч); в) Як і іншыя скаромныя абрадавыя стравы, верашчака гатавалася часта ў дні каляндарных і сямейных свят (В. Цітоў); г) Я паціху ішоў міма, а хлопчык нібы той сланечнік паварочваў следам за мной свой круглы тварык (Я. Маўр).

24 Адзначце складаназлучаны сказ, у якім правільна расстаўлены знакі прыпынку паміж часткамі: а) Толькі верхавіны соснаў гудзелі ледзь чутна, ды шалясцелі няўмоўчныя трапяткія асіны (М. Лынькоў); б) У назве свята Грамніцы чуецца магутная сіла вясенне-летняга стану прыроды але святкуецца яно 15 лютага (І. Крук); в) Або птушак там не было, або яны проста не адважыліся падаваць голасу (Я. Колас); г) Цішыня, і прастор (Э. Агняцвет).

25 Адзначце складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку: а) Правядзенне абрадавых рытуалаў на Радаўніцу калісьці накіроўвалася на тое каб задобрыць душы продкаў, заслужыць іх садзеянне ў жыцці ці гаспадарцы (У. Васілевіч); б) Мы апрануліся

па-зімоваму, бо на дварэ сапраўды стаяў зімні холад хоць і лічылася, што яшчэ восень і выйшлі на двор (В. Хомчанка); в) Я ўсміхнуўся сам сабе і падумаў што чалавек, які аднойчы здрадзіў веры, можа здрадзіць і другі раз (У. Караткевіч); г) Я думаў, што я адзін, але потым заўважыў, што ў адным канцы галерэі стаіць гаспадар з жонкай (У. Караткевіч).

26 Адзначце складаны бяззлучнікавы сказ, паміж часткамі якога ставіцца коска: а) Шмат зяляніны шмат неба над галавою (У. Караткевіч); б) Я ішоў да возера але разгубіўся якою сцяжынкаю падацца? (Я. Пархута); в) Адзін момант у дзвярах ужо стаяў Алесь (У. Караткевіч); г) Мяняецца пара года мяняецца праца (У. Дамашэвіч).

27 Адзначце складаны бяззлучнікавы сказ, паміж часткамі якога ставіцца працяжнік: а) Зніклі нашчадкі князя Вячка няма прамых нашчадкаў Андрэя Полацкага, нястомнага ворага Крэўскай уніі (У. Караткевіч); б) Рыгор закінуў вудачку адразу клюнула (М. Лупсякоў); в) Мне трэба было спяшацца [запісваць фальклор] легенда і казка выміраюць (У. Караткевіч); г) Вакол спакойна дрэмле поле блішчыць у росах сенажаць (А. Бачыла).

28 Адзначце складаны бяззлучнікавы сказ, паміж часткамі якога ставіцца двукроп’е: а) Ён гаворыць я слухаю (А. Савіцкі); б) Яшчэ некалькі хвілін пазіралі яны на дарогу чалавека не было (Я. Колас); в) І раптам я зразумеў гэта не драч, гэта рыпяць… вазы (У. Караткевіч); г) Віця пашпацыраваў па тратуарах, пабываў у парку весялей не стала (А. Якімовіч).

29 Адзначце сказ, у якім простая мова аформлена правільна: а) «Заўтра пішу тэст, – сказаў Мікола. – першы ў сваім жыцці»; б) «Хутка сцямнее, – вымавіў Андрэй і незадаволена дадаў: – трэба вяртацца дадому»; в) З расчыненага акна даляцеў дзіцячы галасок: «Будзем рады бачыць Вас, Ларыса Мікалаеўна!»; г) «Колькі зараз часу? – запытала Валерыя, – Няўжо ніхто не прыйдзе?».

30 Адзначце ўрывак з правільна аформленай ускоснай мовай: а) Я асцярожна гладзіў каласкі, гарнуў іх да твару, шаптаў, што кусціся, жытца, буйна каласіся (М. Парахневіч); б) Сцяжынка сцяжынцы гаворыць: «Сяброўка! Вядзі на прастор іх да роднага слоўка, каб вусны не сохлі, каб сэрцы не смаглі, каб слёзы да кроплі на вейках ачахлі» (М. Лупсякоў); в) Настаўнік сказаў старэйшым вучням, каб яны рыхтаваліся да экзаменаў (Я. Колас); г) Людзі кажуць, што калі рана ўзарэш, то і ўраджай добры збярэш.

## 10 Лексічная сістэма беларускай мовы

1 Лексікалогія − гэта раздзел моваведства, у якім вывучаюцца: а) словы ў сістэмах іх форм словазмянення; б) фанемы і іх сістэма; в) тэорыя і практыка складання слоўнікаў; г) лексічны склад мовы.

2 Укажыце сказ, у якім слова конь ужыта ў прамым значэнні: а) На дарозе маёй конь, белы, / Падабраўся да яго я, смела (А. Гарыца); б) Трактар − гэта жалезны конь сённяшняй вёскі; в) Гімнастычны конь − атрыбут залы лёгкай атлетыкі; г) Шахматны конь ходзіць літарай Г.

3 Укажыце сказ, у якім няма метафары: а) Дворнікі ціха ачышчалі лабавое шкло ад снегу, у машыне панавала цішыня; б) Беларуская мова − дзяржаўная мова нашай краіны; в) Вецер кудлаты на нівах калоссе гайдае, / Стужкай дарога з-пад мокрых калёс выбягае (М. Танк); г) Вечар на захадзе ў попеле тушыць / Кучу чырвоных кавалкаў вугля (М. Багдановіч).

4 Укажыце сказ, у якім няма метаніміі: а) Венесуэла, маштабны крызіс: заводы бастуюць («Наша ніва»); б) Беларускія заводы могуць і павінны выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю; в) Павязлі цягнікі / Восень з вёскі – у горад (М. Танк); г) Я прыслухаўся / – праз мяне / Прарасла Белавежа (Р. Барадулін).

5 Укажыце, у якой групе слоў няма амонімаў: а) малінаўка, гасцінец, каса; б) кампанія, банк, тэрміт; в) лямпа, цыркуль, авал; г) дроб, дыяганаль, дэльта.

6 Укажыце, у якой групе слоў няма паронімаў: а) даследніцкі, даследчы, доследны; б) дыпламат, дыплом, дыпламатыя; в) камбінаваны, камбінатарскі, камбінацыйны; г) лексікалагічны, лексікаграфічны, лексічны.

7 Падбярыце сінонім да слова «матэматыка» з дадзеных перыфраз: а) вечная карміцелька; б) бязносая пані; в) царыца навук; г) белая смерць.

8 З прыведзеных фразеалагізмаў падбярыце антонім да словазлучэння разумны чалавек: а) на сто восемдзесят градусаў; б) як двойчы два; в) праз пятае ў дзясятае; г) абсалютны нуль.

9 Лексіка беларускай мовы паводле паходжання падзяляецца на: а) спрадвечна беларускую і запазычаную; б) агульнаўжывальную і абмежаванага ўжывання; в) актыўную і пасіўную; г) нейтральную і стылістычна афарбаваную.

10 Укажыце групу слоў спрадвечна беларускага паходжання: а) кола, станіна, ступіца; б) клапан, клема, люфт; в) кампрэсар, рэзанатар, трансмісія; г) механізм, тормаз, цыліндр.

11 Укажыце сказ, у якім няма запазычаных слоў: а) Донна Клара твар закрыла / Чорным веерам сувора, / І сказаў адзін гідальга: / «Цяжка ў час прыцьмення сонца» (М. Багдановіч); б) «Плоў, − сказаў Ахмет. − Калісьці дома …» / І пацмокаў смачна языком (П. Панчанка); в) Адкідная металічная крышка для аховы рухавіка аўтамабіля называецца капот; г) Наша сям’я − гэта я, мае бацькі, брат і дзве сястры.

12 Лексіка беларускай мовы паводле сферы выкарыстання падзяляецца на: а) спрадвечна беларускую і запазычаную; б) агульнаўжывальную і абмежаванага ўжывання; в) актыўную і пасіўную; г) нейтральную і стылістычна афарбаваную.

13 Тэрміны і прафесіяналізмы адрозніваюцца шэрагам прыкмет. Прыкмета з пералічаных, што не адрознівае, а злучае два гэтыя паняцці: а) час і шлях фарміравання; б) абмежаванасць ва ўжытку; в) нарматыўны статус; г) экспрэсіўнасць.

14 Укажыце сказ, у якім няма спецыяльнай (прафесійнай) лексікі: а) Экскаватар, сівы ад пылу, / коўш схіліў над аўтамабілем (М. Федзюковіч); б) Многа рэек пасцёрлася за доўгія гады, пагнуліся кастылі, тысячы буксаў перагарэлі, паз’езджаны сотні паравозаў, а чалавечае жыццё – крэмень: ні яму сонца, ні вятры, ні завеі (М. Лынькоў); в) Чакала чайка чаянят / Ручай чакаў ручаянят, /

Чакалі чаяняты, / Пакуль ручаяняты / Памыюць ручаняты (Р. Барадулін); г) Прабіваў, / як праходчык, ён штрэкі, / Як забойшчык, / ён, / майстра пяра, / Не абы-які вугаль, / а рэдкі / Антрацыт выдаваў на-гара (М. Аўрамчык).

15 Укажыце сказ, дзе выкарыстана дыялектная лексіка: а) Наменклатура – гэта сукупнасць уласных імёнаў і назваў, прысвоеных разнастайным рэаліям і аб’ектам навукі і тэхнікі; б) Ты – мяцеліца. Іншаю / Я цябе не ўяўляю, павер (А. Наўроцкі); в) Ледзь Ганна, акружаная гоманам і тлумам, ступіла ў цяперашнюю сваю дамоўку, вінаватасць перад Васілём адразу знікла (І. Мележ); г) Ад прадзедаў спакон вякоў / Мне засталася спадчына; / Паміж сваіх і чужакоў / Яна мне ласкай матчынай (Я. Купала).

16 Укажыце сказ, дзе выкарыстана жаргонная лексіка: а) «Трэба мост памыць», − кажуць на Шклоўшчыне, маючы на ўвазе падлогу; б) За вочы быў Мядзведзь. У вочы – Андрэй Андрэевіч. Атаман, бацька, папаня (М. Лынькоў); в) Сёння добрае надвор’е; г) У адпаведнасці з Законам «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» беларуская мова набыла статус дзяржаўнай у 1990 г.

17 Лексіка беларускай мовы паводле актыўнасці выкарыстання падзяляецца на: а) спрадвечна беларускую і запазычаную; б) агульнаўжывальную і абмежаванага ўжывання; в) актыўную і пасіўную; г) нейтральную і стылістычна афарбаваную.

18 Вылучце групу слоў з неалагізмамі, што не так даўно з’явіліся: а) феадал, ваявода, шляхта; б) брыфінг, маніторынг, рэфлексія; в) лемантар, вакацыі, дзясніца; г) падручнік, канспект, семінар.

19 Вылучце групу слоў з гістарызмамі: а) маршалак, войт, князёўна; б) травець, небазор, вечнабыт; в) дзясніца, ланіты, чало; г) дыяметр, аксанаметрыя, магніт.

20 Вылучце групу слоў з архаізмамі: а) кальчуга, алебарда, мушкет; б) жаўтацвецень, шаўкарунны, вечнаплынны; в) гута, бровар, мануфактура; г) рэле, генератар, ток.

21 Лексіка беларускай мовы са стылістычнага пункту гледжання падзяляецца на: а) спрадвечна беларускую і запазычаную; б) агульнаўжывальную і абмежаванага ўжывання; в) актыўную і пасіўную; г) нейтральную і стылістычна афарбаваную.

22 Укажыце стыль выразаў «бягучыя тэмы дня», «фізкультурнае вырашэнне пытанняў», «эканамічная база», «запаўненне анкеты» (апавяданне А. Мрыя «Гармонія ў ружовым»): а) навуковы; б) мастацкі; в) афіцыйна-дзелавы; г) гутарковы.

23 Фрагмент верша Р. Барадуліна «Зажмурылася смачна аканіца. / Спіць на пярынах белых цішыня. Ад сіверу ссінелая сініца / Ніяк не можа дачакацца дня» насычаны словамі, што адносяцца да стылю: а) навуковага; б) мастацкага; в) афіцыйна-дзелавога; г) гутарковага.

24 У фрагменце верша Р. Крушыны «І надумаўся *вучоны*, / *Інкубатар* ставіць ён. / Дэманструе дэман чорны / Сёння штучны эмбрыён» вылучаныя курсівам словы могуць быць аднесены да стылю: а) навуковага; б) мастацкага; в) афіцыйна-дзелавога; г) гутарковага.

25 У фрагменце з рамана Н. Гілевіча «Родныя дзеці» «А ты?.. *Дзівак*! *Нясмелы дурань*! / Ці ж можна з гэткім паляцець?.. / Успамінай цяпер і думай − / Пра заўтра думай, *целяпень*!» вылучаныя курсівам словы могуць быць аднесены да стылю: а) навуковага; б) мастацкага; в) афіцыйна-дзелавога; г) гутарковага.

## 11 Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення

1 Беларуская тэрміналогія пачынае сваё развіццё: а) у IX ст.; б) у XIV ст.; в) у XVIII ст.; г) у XX ст.

2 Браты Гарэцкія ў 1918 г. выпусцілі слоўнік: а) Беларуская праўная тэрміналогія; б) Руска-беларускі слоўнік; в) Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік; г) Паэтычны слоўнік.

3 На станаўленне беларускай лексікаграфіі паўплывала наступная арганізацыя: а) Цэнтральнае бюро краязнаўства; б) Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў; в) Навукова-тэрміналагічная камісія; г) Савет народных камісараў.

4 Адзначце, які прынцып не быў пакладзены ў аснову выпрацоўкі тэрміналогіі ў першай трэці XX ст.: а) увядзенне ў склад той ці іншай тэрміналогіі агульнаўжывальных слоў; б) утварэнне шматлікіх неалагізмаў; в) выкарыстанне дыялектных слоў; г) актыўнае запазычванне з іншых моў.

5 Аўтарам першага выпуску «Слоўніка тэхнічнай тэрміналогіі» (1932) быў: а) Я. Купала; б) А. Гурло; в) В. Ластоўскі; г) К. Душ-Душэўскі.

6 У 1987 г. з'явілася манаграфія Л. А. Антанюк, у якой разглядаюцца асноўныя пытанні тэрміналогіі. Назва выдання: а) «Тэрміналагічны зборнік»; б) Беларуская Савецкая Энцыклапедыя; в) «Беларуская навуковая тэрміналогія»; г) «Современный русско-белорусский политехнический словарь».

7 Актуальныя праблемы сучаснай беларускай тэрміналогіі не звязаны з: а) даследаваннем традыцый і здабыткаў тэрміналагічнай працы 1920−1930-х гг.; б) зборам і аналізам народных тэрмінаў і наменклатуры з пункту погляду шляхоў папаўнення сучаснай тэрміналогіі; в) неабходнасцю распрацоўкі вузкіх тэрміналагічных сістэм; г) калькаваннем тэрмінаў з рускай мовы.

## 12 Паняцце «тэрмін». Спецыфіка тэрмінаў

1 Тэрмінам уласціва: а) адназначнасць; б) мнагазначнасць; в) вобразнасць і ацэначнасць; г) эмацыйнасць і экспрэсіўнасць.

2 Тэрмінам не ўласціва: а) дакладнасць; б) сістэмнасць; в) навуковасць; г) незразумеласць.

3 Тэрміны адносяцца да: а) спецыяльнай лексікі; б) дыялектнай лексікі; в) жаргоннай лексікі; г) устарэлай лексікі.

4 Да спецыяльнай лексікі, акрамя тэрмінаў, адносяцца: а) дыялектызмы; б) прафесіяналізмы; в) жарганізмы; г) архаізмы.

5 Не з’яўляюцца антонімамі пары тэрмінаў: а) дамінантнасць – рэцэсіўнасць; б) зборка − разборка; в) спонсар – фундатар; г) крохкасць − пластычнасць.

6 Не з’яўляюцца сінонімамі пары тэрмінаў: а) негатыў – пазітыў; б) асіміляцыя – прыпадабненне; в) спонсар – фундатар; г) рашэнне − развязак.

7 Спрадвечнабеларускія тэрміны: а) скарбнік, корань; б) адрас, соус; в) гіпатэнуза, гіпербала; г) лінія, момант.

8 Грэчаскія па паходжанні тэрміны: а) аксіёма, геаметрыя; б) калоквіум, вектар; в) група, штрых; г) опера, цокаль.

9 Лацінскія па паходжанні тэрміны: а) шыфер, штольня; б) авал, бетон; в) фальклор, рэглан; г) бюджэт, пейзаж.

10 Нямецкія па паходжанні тэрміны: а) мазурка, куля; б) кран, шплінт; в) ніпель, тэнт; г) індустрыялізацыя, палігон.

11 Французскія па паходжанні тэрміны: а) рэле, люнет; б) гама, эстэт; в) імпрэсія, траекторыя; г) мадрыгал, цытадэль.

12 З дапамогай лексіка-семантычнага спосабу ўтвораны тэрміны: а) магнітная хваля, эфірны вецер; б) халатнасць, размеркавальнік; в) асіметрыя, контрудар; г) высокаэфектыўна, супрацьпастаўляць.

13 З дапамогай марфалагічнага (суфіксальнага) спосабу ўтвораны тэрміны: а) АКПП, ЦНС; б) нажніцы цэн, падушачка пальца; в) абгрунтаванне, эканаміст; г) адбор, перанос.

14 З дапамогай марфалагічнага (прыставачна-суфіксальнага) спосабу ўтвораны тэрміны: а) супрацоўнік, падаходны; б) ВТ, ПК; в) абмер, моладзь; г) тыпавы праект, крымінальнае права.

15 З дапамогай марфалагічнага (прыставачнага) спосабу ўтвораны тэрміны: а) шапка дакумента, парог рэнтабельнасці; б) ультрагук, экстрапаляцыя; в) ВНУ, ГРМ; г) машынабудаванне, аўтамеханізацыя.

16 З дапамогай марфалагічнага (нульсуфіксальнага) спосабу ўтвораны тэрміны: а) супрацоўнік, падаходны; б) ВТ, ПК; в) абмер, моладзь; г) тыпавы праект, крымінальнае права.

17 З дапамогай марфалагічнага (словаскладання) спосабу ўтвораны тэрміны: а) шапка дакумента, парог рэнтабельнасці; б) ультрагук, экстрапаляцыя; в) супер-эга, міні-мадэль; г) машынабудаванне, аўтамеханізацыя.

18 З дапамогай марфалагічнага (складанасуфіксальнага) спосабу ўтвораны тэрміны: а) нажніцы цэн, падушачка пальца; б) ультрагук, экстрапаляцыя; в) ВНУ, ГРМ; г) машынабудаванне, аўтамеханізацыя.

19 З дапамогай марфалагічнага (абрэвіяцыі) спосабу ўтвораны тэрміны: а) АКПП, ЦНС; б) інвестыцыйны клімат, магнітныя хвалі; в) абгрунтаванне, футбаліст; г) адбор, перанос.

20 З дапамогай сінтаксічнага спосабу ўтвораны тэрміны: а) карданны вал, электрычны рухавік; б) ультрагук, экстрапаляцыя; в) ВНУ, ГРМ; г) працаўладкаванне, самавалоданне.

## 13 Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі

1 Лексікаграфія − гэта раздзел мовазнаўства, які вывучае: а) словы ў сістэмах іх форм словазмянення; б) фанемы і іх сістэма; в) тэорыю і практыку складання слоўнікаў; г) лексічны склад мовы.

2 Пачатак развіцця беларускай лексікаграфіі звязваюць з дзейнасцю: а) Ф. Скарыны; б) С. Буднага; в) В. Цяпінскага; г) Г. Каніскага.

3 Беларуская навуковая лексікаграфія пачала актыўна фарміравацца: а) у XIV ст.; б) у XVII ст.; в) у XIX ст.; г) у XX ст.

4 Сярод прыведзеных імёнаў вылучце групу лексікографаў: а) Я. Колас, М. Багдановіч; б) А. Куляшоў, Е. Лось; в) І. Насовіч, М. Гарэцкі; г) Р. Барадулін, А. Разанаў.

5 Усе слоўнікі дзеляцца на два тыпы: а) энцыклапедычныя і лінгвістычныя; б) перакладныя і тлумачальныя; в) этымалагічныя і арфаграфічныя; г) частотныя і тэрміналагічныя.

6 У слоўнікавым артыкуле тэрміналагічнага слоўніка няма: а) рэестравага слова; б) граматычных і стылёвых памет; в) дэфініцыі; г) этымалагічнай даведкі.

7 Тэрміналагічны слоўнік прызначаны тлумачыць: а) паходжанне слова, яго першапачатковае значэнне; б) спецыфічныя для беларускай культуры словы; в) тэрміны з розных галін навукі, тэхнікі і г. д.; г) правільнае напісанне і вымаўленне слоў.

8 Этымалагічны слоўнік прызначаны тлумачыць: а) паходжанне слова, яго першапачатковае значэнне; б) спецыфічныя для беларускай культуры словы; в) тэрміны з розных галін навукі, тэхнікі і г. д.; г) правільнае напісанне і вымаўленне слоў.

9 Арфаграфічны і арфаэпічны слоўнікі прызначаны тлумачыць: а) паходжанне слова, яго першапачатковае значэнне; б) спецыфічныя для беларускай культуры словы; в) тэрміны з розных галін навукі, тэхнікі і г. д.; г) правільнае напісанне і вымаўленне слоў.

10 Слоўнік безэквівалентнай лексікі прызначаны тлумачыць: а) паходжанне слова, яго першапачатковае значэнне; б) спецыфічныя для беларускай культуры словы; в) тэрміны з розных галін навукі, тэхнікі і г. д.; г) правільнае напісанне і вымаўленне слоў.

## 14 Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы

1 Функцыянальны стыль: а) разнавіднасць мовы, што характарызуецца спецыфікай адбору, спалучэння і арганізацыі моўных сродкаў для пэўных зносін; б) сукупнасць прыёмаў ужывання, адбору і спалучэння сродкаў нацыянальнай мовы; в) спецыфіка мастацкага мыслення; г) сукупнасць прынцыпаў пазнання і адлюстравання свету.

2 Колькасць стыляў, якія налічвае сучасная беларуская літаратурная мова:

а) 5; б) 6; в) 7; г) 8.

3 Не належаць навуковаму стылю падстылі: а) уласна навуковы (акадэмічны); б) навукова-папулярны; в) вучэбна-навуковы; г) прамоўніцкі.

4 Не належаць афіцыйна-справавому стылю падстылі: а) заканадаўчы (юрыдычны); б) дыпламатычны; в) вучэбна-навуковы; г) адміністрацыйна-канцылярскі.

5 Не належаць публіцыстычнаму стылю падстылі: а) газетна-публіцыстычны; б) дыпламатычны; в) радыё- і тэлежурналісцкі; г) прамоўніцкі.

6 Стылёвыя прыкметы навуковага стылю: а) дакладнасць, лагічнасць, афіцыйнасць, безэмацыйнасць; б) падкрэсленая лагічнасць, сэнсавая дакладнасць, інфармацыйная насычанасць, аб'ектыўнасць; в) чаргаванне экспрэсіі і стандарту; г) вобразнасць, эмацыйнасць.

7 Стылёвыя прыкметы афіцыйна-справавога стылю: а) дакладнасць, лагічнасць, афіцыйнасць, безэмацыйнасць; б) падкрэсленая лагічнасць, сэнсавая дакладнасць, інфармацыйная насычанасць, аб'ектыўнасць; в) чаргаванне экспрэсіі і стандарту; г) вобразнасць, эмацыйнасць.

8 Стылёвыя прыкметы публіцыстычнага стылю: а) дакладнасць, лагічнасць, афіцыйнасць, безэмацыйнасць; б) падкрэсленая лагічнасць, сэнсавая дакладнасць, інфармацыйная насычанасць, аб'ектыўнасць; в) чаргаванне экспрэсіі і стандарту; г) вобразнасць, эмацыйнасць.

9 Моўныя сродкі, характэрныя для навуковага стылю: а) агульнаўжывальная лексіка, вобразна-выяўленчыя сродкі; б) агульнаўжывальная, грамадска-палітычная, ацэначная лексіка, метафарычнасць тэрмінаў, загадны лад дзеясловаў; в) абстрактная, тэрміналагічная, спецыяльная лексіка, канцылярскія штампы; г) агульнаўжывальныя словы, вялікая колькасць тэрмінаў; развітыя апавядальныя сказы, злучнікавая падпарадкавальная сувязь.

10 Моўныя сродкі, характэрныя для афіцыйна-справавога стылю: а) агульнаўжывальныя словы, вялікая колькасць тэрмінаў; развітыя апавядальныя сказы, злучнікавая падпарадкавальная сувязь; б) абстрактная, тэрміналагічная, спецыяльная лексіка, канцылярскія штампы; складаныя сказы; в) агульнадаступнасць, чаргаванне экспрэсіі і стандарту; г) мастацкая вобразнасць, эмацыйнасць.

## 15 Навуковы стыль

1 Да навуковага стылю не адносяцца наступныя лексічныя асаблівасці: а) кніжная і абстрактная лексіка; б) навуковыя тэрміны; в) словы ў прамым значэнні; г) канцылярызмы.

2 Да навуковага стылю не адносяцца наступныя марфалагічныя асаблівасці: а) аддзеяслоўныя і аддзеепрыметнікавыя назоўнікі; б) безасабовыя формы; в) нанізванне формаў роднага склону, формы адзіночнага ліку ў значэнні множнага; г) дзеяслоўныя формы з пазачасавым значэннем, дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі.

3 Да навуковага стылю не адносяцца наступныя сінтаксічныя асаблівасці:

а) стандартныя сінтаксічныя канструкцыі; б) простыя развітыя і складаназалежныя сказы; в) безасабовыя сказы; г) пабочныя канструкцыі, дзеепрыметныя і дзеепрыслоўныя звароты.

4 Укажыце «лішні» жанр у межах уласна навуковага падстылю навуковага стылю: а) манаграфія; б) артыкул; в) дысертацыйнае даследаванне; г) вучэбны дапаможнік.

5 Адзначце, якія жанры не адносяцца да навуковых: а) даклад, праектная дакументацыя; б) заява, пратакол; в) анатацыя, рэферат; г) слоўнік, даведнік.

6 Укажыце «лішні» элемент схемы навуковых тэкстаў: а) тэзіс; б) пралог; в) доказ; г) вывад.

7 Тэксты маюць складаюцца з уступу, апісання, аналізу, вывадаў у стылі: а) навуковым; б) мастацкім; в) афіцыйна-справавым; г) публіцыстычным.

8 Сціслае, кароткае апісанне ці характарыстыка кнігі, артыкула або зборніка − гэта: а) рэферат; б) даклад; в) анатацыя; г) рэцэнзія.

9 Пісьмовы водзыў на навуковую працу − гэта: а) рэферат; б) даклад; в) анатацыя; г) рэцэнзія.

10 Вуснае ці пісьмовае выступленне, разгорнутае асвятленне пэўнай тэмы − гэта: а) рэферат; б) даклад; в) анатацыя; г) рэцэнзія.

11 Кампазіцыйна арганізаваны, абагульнены выклад зместу крыніцы інфармацыі − гэта: а) рэферат; б) даклад; в) анатацыя; г) рэцэнзія.

12 Сказ «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў рэалізуецца пры адпаведнай арганізацыі праз тэхналагічны працэс, які з’яўляецца часткай агульнага вытворчага працэсу на аўтатранспартным прадпрыемстве або станцыі тэхнічнага абслугоўвання» адносіцца да стылю: а) мастацкага; б) публіцыстычнага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

13 Сказ «Электрычныя рухавікі пастаяннага току ўжываюць у тых электраприводах, дзе патрабуецца вялікі дыяпазон рэгулявання хуткасці, высокая дакладнасць падтрымання хуткасці кручэння прывода» адносіцца да стылю: а) мастацкага; б) публіцыстычнага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

14 Сказ «Андрэ-Мары Ампе́р (20.011775 – 10121836) − выдатны французскі матэматык і фізік. Ампер − адзінка сілы электрычнага току ў СВ (сістэме вымярэнняў)» адносіцца да стылю: а) мастацкага; б) гутарковага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

15 Укажыце, у якім выпадку дадзена правільнае бібліяграфічнае апісанне крыніцы: а) Беларуская мова (прафесійная лексіка) : дапаможнік / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. − Мінск : Тетралит, 2013. − 288 с.; б) Беларуская мова (прафесійная лексіка) : дапаможнік. − Мінск : Тетралит, 2013. − 288 с.; в) Беларуская мова (прафесійная лексіка) : дапаможнік / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. − Мінск. − 288 с.; г) Беларуская мова (прафесійная лексіка) : дапаможнік / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. − Мінск : Тетралит, 2013.

## 16 Афіцыйна-справавы стыль

1 Да афіцыйна-справавога стылю не адносяцца наступныя лексічныя асаблівасці: а) архаізмы і моўныя штампы; б) вобразна-выяўленчыя сродкі; в) словы ў прамым значэнні; г) тэрміны і канцылярызмы.

2 Да афіцыйна-справавога стылю не адносяцца наступныя марфалагічныя асаблівасці: а) аддзеяслоўныя назоўнікі; б) безасабовыя дзеясловы і інфінітывы; в) нанізванне формаў роднага склону, формы адзіночнага ліку ў значэнні множнага; г) дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі.

3 Да афіцыйна-справавога стылю не адносяцца наступныя сінтаксічныя асаблівасці: а) стандартныя сінтаксічныя канструкцыі, безасабовыя сказы; б) простыя развітыя і складаназалежныя сказы; в) параўнальныя звароты; г) рэгламентацыя парадку слоў.

4 Да канцылярскага падстылю афіцыйна-справавога стылю не адносяцца: а) заява, даверанасць; б) аўтабіяграфія, рэзюмэ; в) правіла, інструкцыя; г) закон, мемарандум.

5 Да афіцыйна-справавых не адносяцца жанры: а) рашэнне, пастанова; б) палажэнне, правіла; в) артыкул, нарыс; г) акт, пратакол.

6 Справавая папера, якая заканадаўча пацвярджае розныя гаспадарчыя аперацыі, прававыя адносіны, дзеянні юрыдычных асоб і грамадзян, − гэта: а) дакумент; б) заява; в) артыкул; г) пратакол.

7 Абавязковы інфармацыйны элемент дакумента, строга замацаваны за пэўным месцам на бланку, лісце, − гэта: а) табліца; б) рэквізіт; в) схема; г) спіс супрацоўнікаў.

8 Да абавязковых рэквізітаў дакумента не адносіцца: а) подпіс; б) назва віду дакумента; в) дата; г) малюнак урадавых узнагарод.

9 Пісьмовая просьба адной асобы ці групы асоб ва ўстанову альбо да службовай асобы − гэта: а) пратакол; б) заява; в) загад; г) скарга.

10 Дакумент, які змяшчае інфармацыю аб навыках, вопыце работы, адукацыі і іншую, што адносіцца да справы інфармацыю, звычайна патрабуецца пры разглядзе кандыдатуры чалавека для найму на працу: а) заява; б) аўтабіяграфія; в) рэзюмэ; г) даверанасць.

11 Дакумент, у якім змешчаны звесткі пра жыццёвы шлях, выкладзеныя ад першай асобы: а) даведка; б) аўтабіяграфія; в) тлумачальная запіска; г) дакладная запіска.

12 Дакумент, які выказвае меркаванне адносна якіх-небудзь здарэнняў, сітуацый, учынкаў, паводзін, − гэта: а) тлумачальная запіска; б) акт; в) службовая характарыстыка; г) дакладная запіска.

13 Сказ «Я, Барсукоў Уладзімір Андрэевіч, нарадзіўся ў 1972 годзе ў вёсцы Бярозаўка Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям’і» адносіцца да стылю: а) мастацкага; б) публіцыстычнага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

14 Сказы «Судовае пасяджэнне адкрыта а «9» гадзіне. На судовае пасяджэнне з’явіліся: 1 Прадстаўнікі пацярпелага боку (сям’я Каваленкаў). 2 Абвінавач-

ваемыя Міхасёў В. І. і Клімаў М. Р. 3 Сведкі здарэння Хвашчэня В. Л., Міхаленя Г. Ф.» адносяцца да стылю: а) мастацкага; б) публіцыстычнага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

15 Сказ «17 лістапада 2000 года мы, старшыня прафкама ўніверсітэта Марчук П. І., член групы народнага кантролю Піліпчык В. М. і намеснік старшыні студсавета Сацута М. Т., праверылі, як захоўваецца абсталяванне ў клубе «Арбіта», і выявілі наступнае» адносіцца да стылю: а) мастацкага; б) публіцыстычнага; в) афіцыйна-справавога; г) навуковага.

## 17 Культура прафесійнага маўлення

1 Сутнасць дакладнасці маўлення ў: а) адпаведнасці сэнсу слоў, выказванняў рэаліям, сітуацыям; б) сэнсавай звязанасці частак выказвання паміж сабой; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

2 Адзначце, у якім выпадку лексічнае значэнне слова вызначана няправільна: а) дрот − выраб з металу ў выглядзе тоўстай гібкай ніці; б) мартэн − асобая печ для выплаўкі сталі; в) прэс-папье − сустрэча дзяржаўных, палітычных, культурных дзеячаў прадстаўнікамі СМІ; г) утылізацыя − выкарыстанне чаго-небудзь з карысцю.

3 Вызначце сказ, у якім не парушана лексічная спалучальнасць слоў: а) Пасля такой грандыёзнай будоўлі трэба зрабіць вынікі, каб пазбегнуць памылак у будучым; б) Беларуска-Расійскі ўніверсітэт − гэта флагман распаўсюджвання асветы; в) Выкананне правіл пажарнай бяспекі − неабходная ўмова захавання жыцця і здароўя; г) Малады вучоны расчыніў часопіс «Архітэктура і будаўніцтва» і засяродзіўся на артыкуле.

4 Укажыце, у якім сказе няправільна выкарыстана шматзначнае слова: а) Вершы Янкі Купалы напаўняюць чытача гармоніяй і шчасцем; б) Будаўнікі не чараўнікі: прапанаваны тэрмін не можа адпавядаць здароваму сэнсу; в) Дэманстрацыя вучэбнага фільма адбылася на трэцяй пары; г) Раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні» спадабаўся студэнтам.

5 Адзначце, у якім выпадку словы з’яўляюцца сінонімамі: а) архітэктар – дойлід; б) канструкцыя – дэструкцыя; в) атам – электрон; г) болт − шуруп.

6 Адзначце, у якім выпадку словы не з’яўляюцца паронімамі: а) факультатыўны – факультэцкі; б) пасірацець – пасіраціць; в) магістрат – магістрант; г) рашэнне − развязак.

7 Адзначце, у якім выпадку словы з’яўляюцца паронімамі: а) секунда – секундант; б) ігрок – гулец; в) праектны – праекціровачны; г) дэкан − кіраўнік.

8 Адзначце сказ, у якім ужыты непатрэбны паўтор (плеаназм): а) Веданне беларускай граматыкі дазваляе пазбегнуць шматлікіх памылак; б) Аплата − згодна прэйскуранту цэн; в) Слова «тэхналогія» мае грэчаскія карані;

г) Праграмнае забеспячэнне − гэта праграмы для кіраўніцтва работай камп'ютара.

9 Укажыце групу слоў, дзе няма міжмоўных амонімаў: а) вяселле, краскі, мех; б) поўнач, поўдзень, лук; в) прозвішча, ступень, час; г) стол, метраном, рапіра.

10 Сутнасць лагічнасці маўлення ў: а) адпаведнасці сэнсу слоў, выказванняў рэаліям, сітуацыям; б) сэнсавай звязанасці частак выказвання паміж сабой; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

11 Знайдзіце сказ, у якім вытрыманы нормы лагічнасці: а) Хворы паступіў у бальніцу пасля выкліку брыгады хуткай дапамогі ў надзвычай цяжкім стане; б) Слухаючы выкладчыка, студэнтаў не пакідала пачуццё захаплення; в) Хто з каго смяецца, той таму і застанецца; г) Патрабуецца на пастаянную работу супрацоўнік для аддзела, які мае вышэйшую адукацыю.

12 Сутнасць дарэчнасці маўлення ў: а) адпаведнасці сэнсу слоў, выказванняў рэаліям, сітуацыям; б) сэнсавай звязанасці частак выказвання паміж сабой; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

13 Укажыце сказ, які адлюстроўвае дарэчнасць і чысціню маўлення: а) На заводзе кульгае дысцыпліна, таму адміністрацыя прымае неабходныя меры; б) Раніцай была цудоўная, таму вадзяныя працэдуры я рэалізаваў з вялікім задавальненнем; в) Паважаны юбіляр, вы выдатна працуеце на пасадзе дырэктара ААТ «Белбуд»; г) Тэмбр голасу адыгрывае значную ролю пры ўсталяванні кантакту.

14 Сутнасць чысціні маўлення ў: а) разнастайнасці выкарыстання моўных сродкаў і ў адсутнасці ці вельмі рэдкім паўтарэнні адных і тых самых слоў і выразаў; б) спалучэнні колькасці і якасці ўжывання моўных сродкаў: сінонім, эпітэтаў, метафар, фразеалагізмаў, параўнанняў і інш.; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

15 Сутнасць багацця маўлення ў: а) разнастайнасці выкарыстання моўных сродкаў і ў адсутнасці ці вельмі рэдкім паўтарэнні адных і тых самых слоў і выразаў; б) спалучэнні колькасці і якасці ўжывання моўных сродкаў: сінонім, эпітэтаў, метафар, фразеалагізмаў, параўнанняў і інш.; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

16 Знайдзіце сказ, у якім няма сродкаў мастацкай выразнасці: а) У сіняй смузе песцяцца далі (Я. Колас); б) Загад − гэта прававы акт (Даведнік па справаводстве); в) Мая далонь – пляцоўка касмадрома, / З якой увысь

стартуюць караблі (П. Макаль); г) У гэты лес прыходжу часта я / Пацешыцца маладняком шумлівым (М. Танк).

17 Сутнасць выразнасці маўлення ў: а) разнастайнасці выкарыстання моўных сродкаў і ў адсутнасці ці вельмі рэдкім паўтарэнні адных і тых самых слоў і выразаў; б) спалучэнні колькасці і якасці ўжывання моўных сродкаў: сінонім, эпітэтаў, метафар, фразеалагізмаў, параўнанняў і інш.; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў, абрэвіятур.

18 Сутнасць правільнасці маўлення ў: а) адпаведнасці нормам беларускай літаратурнай мовы; б) спалучэнні колькасці і якасці ўжывання моўных сродкаў: сінонім, эпітэтаў, метафар, фразеалагізмаў, параўнанняў і інш.; в) адпаведнасці моўных сродкаў тэме, сітуацыі, мэце выказвання; г) адсутнасці ў маўленні дыялектызмаў, слоў-паразітаў, жарганізмаў, таўталогіі, русізмаў, варварызмаў і абрэвіятур.

19 Адзначце групу слоў, якая адпавядае арфаэпічным нормам беларускай мовы: а) [шш]ытак, вучы[с'с']я, дасле[чч]ык; б) [с']хема, [с']нег, [с']вінец; в) супер[і]нтэлект, лі[дж]ба, нала[чч]ык; г) ме[тар], [з]жаць, ва[к]зал.

20 Адзначце групу слоў, якая адпавядае акцэнталагічным нормам беларускай мовы: а) хме́льны, цэ́мент, глі́няны; б) імя́, рэ́мень, не́сці; в) трапе́за, кухо́нны, крапіва́; г) электрапрыво́д, аднаразо́вы, дасы́та.

21 Адзначце групу слоў, якая адпавядае арфаграфічным сродкам беларускай мовы: а) МТЗ, Узброеныя сілы рэспублікі Беларусь, трактар «Беларус; б) РБ, Ордэн Францыска Скарыны, часопіс «Машынабудаванне»; в) БЕЛАЗ, Асіповіцкае водасховішча, Біблія; г) МАЗ, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Дзень аўтамабіліста.

22 Адзначце групу слоў, якая адпавядае арфаграфічным нормам беларускай мовы: а) агентсва, адвакатскі; б) Навагруччына, Беластокчына; в) аксіома, стадзіон; г) кансіліум, радыус.

23 Адзначце групы фразеалагізмаў, якія не звязаныя з моўным этыкетам: а) з лёгкай парай, хлеб ды соль, у добры час; б) адсохні язык, праваліцца на гэтым месцы, не сысці з гэтага месца; в) міласці просім, дзень добры, маё шанаванне; г) бывай здароў, усяго добрага, шчасліва.

24 У змест паняцця «тэхніка маўлення» не ўваходзіць: а) правільнае маўленчае (фанацыйнае) дыханне; б) добрая дыкцыя, інтанацыя; в) выразнае вымаўленне, пастаўлены голас; г) наяўнасць рэцыпіента.

25 У змест паняцця «невербальныя сродкі ўздзеяння» не ўваходзіць: а) міміка, жэсты; б) манера выступаць і трымацца; в) словы, прамова; г) поза прамоўцы.

# Спіс літаратуры

1 Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / Уклад. В. П. Русак [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2017. − 757 с.

2 **Баршчэўская, А. Л.** Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / А. Л. Баршчэўская, Л. П. Баршчэўскі. – Мінск: ІП Уладзімір Сіўчыкаў, 2018. – 560 с.

3 Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя навукі: вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / М. Р. Прыгодзіч [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. І. Куліковіча. – Мінск: РІВШ, 2015. – 258 с.

4 Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Экалагічны профіль : вучэбны дапаможнік / М. М. Круталевіч [і інш.] ; пад рэд. М. М. Круталевіча. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2020. – 283 с.

5 **Булыко**, **Х. П.** Большой белорусско-русский, русско-белорусский словарь / Х. П. Булыко, Н. В. Полещук. – 3-е изд. – Мінск : Попурри, 2018. – 624 с.

6 **Буракова, М. У.** Беларуская мова. Тэхнічная тэрміналогія : вучэбны дапаможнік / М. У. Буракова. – Мінск : РІВШ, 2016. – 264 с.

7 **Губская, В. М.** Беларуская мова для эканамістаў : дапаможнік / В. М. Губская, І. І. Шматкова. – Мінск: БДЭУ, 2019. – 135 с.

8 **Зразікава, В. А.** Беларуская мова. Прафесійная лексіка для эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. А. Зразікава, А. В. Губкіна. – Мінск : Вышэйшая школа, 2016. – 383 с.

9 Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў: у 2 т. Т. 1: А–Н / Пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск: Беларусь, 2022. – 487 с.

10 Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў: у 2 т. Т. 2: Н–Я / Пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск: Беларусь, 2022. – 483 с.